# Сучасны куратар

**Скласці партрэт сучаснага куратара вучэбных груп УВА днямі паспрабавалі на І Рэспубліканскім форуме куратараў на пляцоўцы РІВШ.**

“Асноўная мэта нашага форуму — актывізацыя і ўдасканаленне дзейнасці куратараў у агульнай сістэме выхаваўчай работы ва УВА. Нам было важна падштурхнуць куратараў да павышэння эфектыўнасці сваёй работы, сфарміраваўшы прафесійную супольку куратараў, якой ім так не хапала”, — паведаміла начальнік упраўлення выхаваўчай работы РІВШ Іна Галавач.

У час форуму былі выяўлены найбольш паспяховыя практыкі і напрацоўкі, творчыя ініцыятывы куратараў. Яны складуць “Метадычную скарбонку”, якая ў хуткім часе з’явіцца на сайце РІВШ, і імі змогуць карыстацца ўсе куратары. “У кожнай УВА нашай краіны штогод праводзіцца конкурс на лепшага куратара, але агульнага форуму не было. Калі мы аб’явілі аб яго правядзенні, да нас прыйшло каля 100 заявак, аднак нам прыйшлося выбраць толькі найбольш цікавыя. Былі адабраны 75 куратараў. Яны старанна рыхтаваліся і вельмі хваляваліся, бо не кожны рызыкне прадставіць сваю ідэю на рэспубліканскім узроўні. У выніку ў нас каля 30 пераможцаў у трох намінацыях. Форум атрымаўся сапраўдным святам адукацыі і зносін, і яго ўдзельнікі папрасілі зрабіць форум традыцыйным”, — дадала Іна Мікалаеўна.

На палях форуму адбыўся семінар “Работа куратара: сучасныя выклікі” з удзелам прадстаўнікоў Мінадукацыі, БПЦ, РІВШ, рэспубліканскіх цэнтраў і вядучых УВА краіны. Удзельнікі абмеркавалі актуальныя падыходы ў арганізацыі работы куратараў — нарматыўна-прававое забеспячэнне і арганізацыйна-метадычныя аспекты. Закранулі таксама пытанні фарміравання пачуцця патрыятызму ў моладзі, духоўна-маральных каштоўнасцей і павагі да нацыянальных традыцый. Абмеркавалі і псіхолага-педагагічныя аспекты ў рабоце куратара, у тым ліку сацыяльна-псіхалагічную адаптацыю першакурснікаў.

“Сёлета атрымалася даволі цікавая форма работы з куратарамі, якая спалучыла вучэбны семінар кураўнікоў метадычных аб’яднанняў, школ і саветаў куратараў УВА і непасрэдна сам форум, дзе куратары прадставілі свае праекты і найбольш цікавыя формы работы са студэнцкай моладдзю. Два дні папрацаваўшы ў такім інтэнсіўным фармаце, куратары абмяняліся вопытам, меркаваннямі, узнялі шэраг праблемных пытанняў, азнаёміліся з нарматыўнымі актамі”, — падкрэсліла намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі — начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Беларусі Таццяна Анатольеўна Сіманоўская.

Яна звярнула ўвагу на неабходнасць актуалізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы са студэнцкай моладдзю: “Пытанні, якія мы абмеркавалі, тычыліся ў першую чаргу абноўленай нарматыўна-прававой базы, якая была прынята на працягу года Міністэрствам адукацыі ў сувязі з прыняццем абноўленага Кодэкса аб адукацыі. Убачыла свет значная колькасць нарматыўных дакументаў, у тым ліку і па пытаннях ідэалагічнай і выхаваўчай работы. А таму ў нас ёсць просьба да ўдзельнікаў форуму — унутры сваіх УВА правесці сходы, метадычныя пасяджэнні, каб усе новаўвядзенні былі даведзены да іх калег і выкарыстоўваліся ў вучэбным працэсе”.

На палях форуму таксама прагучалі вельмі каштоўныя прапановы па ўдасканаленні журнала куратара — асноўнага дакумента, які вядзе куратар вучэбнай групы, па фарміраванні зместу і раскладу куратарскіх і інфармацыйных гадзін, па іх працягласці і формах правядзення. “Вынікам стала прапанова аб правядзенні рэгулярных семінараў куратараў. Зараз мы плануем выязджаць у асобныя УВА, каб непасрэдна на месцах аказваць метадычную дапамогу куратарам. Думаю, што форум стане традыцыйным, бо ён прадэманстраваў запатрабаванасць і неабходнасць такіх мерапрыемстваў”, — дадала Т.А.Сіманоўская.



# Каардынатар і інфарматар

*Форум “Мы — куратары” аб’яднаў 75 куратараў і прадстаўнікоў метадычных аб’яднанняў куратараў з амаль 50 устаноў вышэйшай адукацыі краіны.*

**Адным з ключавых момантаў форуму стала прэзентацыя метадычных распрацовак.**

Куратары прадставілі іх на наступных намінацыях: “Я — куратар” — практыка-арыентаваныя і творчыя праекты, “Пра мінулае памяць захаваем” — інфармацыйна-адукацыйныя праекты, звязаныя з захаваннем гістарычнай памяці, “Быць патрыётам” — метадычныя распрацоўкі, накіраваныя на выхаванне пачуцця патрыятызму ў студэнцкай моладзі.

Адной з пераможцаў у намінацыі “Я — куратар” стала старшы выкладчык кафедры сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі выконваючы абавязкі намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце інстытута псіхалогіі БДПУ імя Максіма Танка Валянціна Макрацова. Яна з’яўляецца куратарам больш за 15 гадоў і перакананa: асноўная функцыя куратара — каардынуючая.



“На мой погляд, куратар — гэта каардынатар дзеянняў студэнтаў. Канечне, дзейнасць куратара на 1 курсе адрозніваецца ад работы з навучэнцамі 2 і 3 курсаў. Бо спачатку куратар выконвае ролю памочніка студэнта, а пасля ўжо калегі і сябра. І паступова роля памочніка мяняецца на раўназначнага ўдзельніка ўсіх сумесных падзей. Калі студэнты адчуваюць аўтарытэтнасць куратара і яго павагу да сваіх інтарэсаў, жаданняў, памкненняў і каштоўнасцей, то фарміруюцца зносіны на роўных. Менавіта ўзаемапавага — гарант даверлівых адносін”, — сцвярджае Валянціна Міхайлаўна.

Сучаснасць дыктуе свае правілы, мяняюцца каштоўнасці моладзі, і куратар, як і ўсе педагогі, павінен не стаяць на месцы, а рухацца наперад і разбірацца ў тым, што цікава яго навучэнцам. “Я заўважыла, што адносіны з вертыкальнага ўзроўню перайшлі на гарызантальны. Калі раней куратар меў выключную статуснасць, то зараз для студэнтаў становяцца больш важнымі яго інфармаванасць, актыўнасць, мабільнасць і крэатыўнасць, яго здольнасць захапіць і павесці за сабой. А гэта ўжо іншыя складнікі аўтарытэта. Дарэчы, калі на першы план выходзяць жаданні і магчымасці студэнтаў, то выхаваўчыя мерапрыемствы становяцца больш значнымі і цікавымі для іх”, — лічыць куратар.

На Рэспубліканскім форуме куратараў В.М.Макрацова прадставіла праект “Мы разам”, а таксама правяла інтэнсіў “Удасканаленне міжкультурнай кампетэнцыі супрацоўнікаў УВА, якія працуюць з замежнымі студэнтамі”, бо ў БДПУ асаблівая ўвага ўдзяляецца адаптацыі замежных студэнтаў.

“Мой праект накіраваны на павышэнне эфектыўнасці ўзаемадзеяння беларускіх і замежных студэнтаў. Ён складаецца з дыягностыкі — тэставых методык, што дапамагаюць вывучыць асаблівасці этнічнай культуры студэнтаў, іх узровень талерантнасці, і трэнінгавай праграмы, якую мы распрацоўваем абапіраючыся на папярэдне праведзеныя тэсты. Сустракаючыся адзін раз на тыдзень на працягу навучальнага года, студэнты з задавальненнем удзельнічаюць у такім трэнінгу, бо пастаянна даведваюцца штосьці новае. А пасля, набываючы ўпэўненасць у сабе, пачынаюць удзельнічаць у рабоце навуковых лабараторый, у спартыўных і творчых мерапрыемствах”, — расказала Валянціна Міхайлаўна.

У сваю чаргу Таццяна Данейка, намеснік дэкана па вучэбна-метадычнай, навуковай і выхаваўчай рабоце факультэта інфармацыйнай бяспекі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, падкрэсліла, што куратар — гэта арганізатар вучобы і жыцця студэнтаў ва ўніверсітэце, ад якога залежыць маральна-псіхалагічны клімат у вучэбнай групе і адносіны студэнтаў да вучобы, навуковай і грамадскай дзейнасці.

“Мой куратарскі стаж — 6 гадоў. За гэты час я пераканалася, што куратар вучэбнай групы павінен быць мэтанакіраваным, працавітым, таварыскім, актыўным, настойлівым і ўмець суперажываць. Безумоўна, куратар павінен быць прафесіяналам у сваёй сферы дзейнасці. Да таго ж куратар, як добры менеджар, павінен умець праектаваць сваю дзейнасць і кіраваць сваім часам”, — сказала Таццяна Міхайлаўна.

Зразумела, што менавіта на плечы куратара кладзецца інфармацыйная, ідэалагічная і выхаваўчая работа са студэнтамі. “Для мяне важна, каб студэнты групы, якую я курырую, былі выхаванымі, этычнымі, гуманнымі, выступалі за “зялёную эканоміку”, вялі здаровы і актыўны лад жыцця і, безумоўна, былі патрыётамі. Таму сваю куратарскую дзейнасць я стараюся так спланаваць і арганізаваць, каб студэнтам было цікава і яны з задавальненнем падключаліся да рэалізацыі розных праектаў”, — паведаміла куратар.

На Рэспубліканскім форуме куратараў яна прэзентавала два праекты. Першы — “Захоўваючы памяць аб мінулым, будуем будучыню! — 4 гады гістарычнай памяці”. Гэта сумесны патрыятычны праект студэнтаў факультэта інфармацыйнай бяспекі і вядомага архітэктара і скульптара Валянціна Занковіча. За 4 гады існавання праекта ў ім паўдзельнічала больш за 1000 студэнтаў, было праведзена звыш 20 разнастайных мерапрыемстваў, а сёлета да Дня народнага адзінства адкрыта віртуальная галерэя скульптурных работ В.Занковіча.

“Другі праект — “Люблю наш край — старонку гэту…”. У яго аснове — аўтарскія пешыя, вела- і бегавыя экскурсіі па нашай сталіцы. Такі фармат правядзення куратарскіх гадзін дазваляе ўзбагаціцца новымі ведамі і станоўчымі эмоцыямі ўсім удзельнікам нашых міні-вандровак. Мне вельмі прыемна, што мае праекты ацанілі арганізатары форуму і мяне ўзнагародзілі дыпломам пераможцы ў намінацыі “Я — куратар”. Увогуле форум дазволіў усім актыўным куратарам з розных УВА пазнаёміцца, паразмаўляць, абмяняцца кантактамі, каб пасля пачаць



*Сучасны куратар універсітэцкай вучэбнай групы — гэта каардынатар дзейнняў студэнтаў, арганізатар вучобы і жыцця студэнтаў ва ўніверсітэце, інфарматар, адміністратар і нават крыху псіхатэрапеўт. Актыўны, ініцыятыўны, крэатыўны, шчыры, уважлівы, настойлівы і стрэсаўстойлівы. А яшчэ прафесіянал сваёй справы, які любіць не толькі сваю работу, але і сваіх выхаванцаў, прычым не важна колькі ім гадоў: 17, 20 або 30. Яны назаўсёды застаюцца ў сэрцах куратараў.*

ствараць сумесныя праекты. Я была ўражана колькасцю цікавых праектаў, што рэалізуюць мае калегі-куратары. Я ў захапленні ад іх энтузіязму і жадання сеяць разумнае, добрае, вечнае ў сэрцах маладых людзей", — падзялілася ўражаннямі Т.М.Данейка.

Выкладчыца Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі Алена Дзехцярэнка акцэнтавала ўвагу на тым, што самае дарагое ў рабоце куратара — гэта "блізкія зносіны са сваёй "крылатай" сям'ёй": "Я з'яўляюся куратарам каля 10 гадоў, і з усімі сваімі выпускнікамі падтрымліваю зносіны па сённяшні дзень. Яны запрашаюць мяне на вяселлі, паведамляюць пра нараджэнне дзетак, прыязджаюць у госці, дзеляцца сваімі поспехамі і дасягненнямі. Я ўсіх іх люблю!"

Алена Аляксандраўна таксама прытрымліваецца думкі, што куратар — гэта найперш каардынатар, які і сам умее працаваць у камандзе, ставіць мэты і дасягаць іх, а яшчэ застаецца стрэсаўстойлівым у любых абставінах.

"Самае галоўнае — шчырасць і сумленнасць у адносінах з навучэнцамі. На першай сустрэчы я заўсёды расказваю пра сябе, дзе і як вучылася, пра любімыя і нелюбімыя прадметы. І тады яны адчуваюць маю шчырасць і лепш ідуць на кантакт. Я заўсёды прапаноўваю ім на першых занятках напісаць на аркушы паперы, што яны адчуваюць у цяперашні час і што, магчыма, будуць адчуваць, калі скончаць нашу акадэмію. Затым усе гэтыя запіскі я кладу ў скрынку і гавару, што мы яе адкрыем на іх выпускным і яны паглядзяць, як і што змянілася ў іх жыцці і поглядах. Ведаеце, часам нашы курсанты прызнаюцца, што не адлічыліся з акадэміі, бо вельмі хацелі адкрыць гэтую скрынку", — з усмешкай расказала куратар.

У час размовы з Аленай Дзехцярэнка я і сама адчула яе любоў і ўважлівасць да сваіх выхаванцаў, было відаць, як яна стараецца раскрыць кожнага з іх, выкарыстоўваючы розныя метады і падыходы. "Групу, якую курырую, я звычайна падзяляю на ўмоўныя сектары, дзе кожны мае сваю задачу. Напрыклад, калі бачу, што хтосьці не выпускае смартфон з рук, то яму мы даручаем інфармацыйную частку. Хтосьці становіцца фатографам, спартсменам, а хтосьці нават захавальнікам часу. Пасля навучэнцы мяняюцца сектарамі і ролямі, бо кожны павінен усё паспрабаваць і зразумець, у чым ён мацнейшы. Гэта неабходна для таго, каб пасля выпуску ў любым калектыве яны маглі паказаць сябе з лепшага боку, каб ім і з імі было камфортна працаваць. Асноўны акцэнт у сваёй куратарскай дзейнасці раблю на развіцці ў курсантаў цвёрдасці характару, самакантролю, энергічнасці, інтэлекту, а яшчэ ўдзячнасці, аптымізму і дапытлівасці", — адзначыла Алена Аляксандраўна.

Разважаючы пра карысць Рэспубліканскага форуму куратараў, А.А.Дзехцярэнка сказала, што такія мерапрыемствы варта праводзіць часцей: "Я шчаслівая, што атрымала дыплом пераможцы і трапіла ў лік 13 лепшых куратараў, гэта першае маё дасягненне на рэспубліканскім узроўні. На форуме разам з калегамі мы змаглі абмяняцца вопытам, падзяліцца сваімі метадычнымі напрацоўкамі і азнаёміцца з адметнымі і нетрадыцыйнымі формамі і метадамі работы са студэнцкай моладдзю, штосьці запазычыць адно ў аднаго. І гэта дарагога каштуе!"

**Вольга АНТОНЕНКАВА.**
**Фота РІВШ.**



Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу сярод педагогаў "Прававая майстэрня".

# Маем права

Выхоўваць прававую культуру, фарміраваць актыўную грамадзянскую пазіцыю чалавека неабходна з самага дзяцінства. Ролю педагогаў у гэтай справе цяжка пераацаніць. Каб даць ім магчымасць падзяліцца сваімі напрацоўкамі ў названым кірунку, стымуляваць да пошуку новых форм падачы інфармацыі, і быў задуманы конкурс "Прававая майстэрня". Яго арганізатарамі выступілі Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі, Міністэрства адукацыі, Міністэрства юстыцыі, Беларуская натарыяльная палата, Беларуская рэспубліканская калегія адвакатаў.

Інтэлектуальнае спаборніцтва праводзілася з 15 чэрвеня па 11 кастрычніка гэтага года. У ім прынялі ўдзел звыш 330 педагогаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Аўтары лепшых работ вылучаны ў дзвюх асноўных і пяці дадатковых намінацыях. Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў адбылася ў Нацыянальным цэнтры прававой інфармацыі.

— Дзякуй за тое, што не засталіся абыякавымі да гэтай актуальнай ініцыятывы і падтрымалі яе. Конкурс плануецца праводзіць і ў далейшым. Усе мы разумеем важнасць тэмы, якой ён прысвечаны. Дакладная прававая інфармацыя, якую дзеці атрымліваюць своечасова, у зразумелай для іх форме, дапаможа ім выбраць у жыцці правільныя арыенціры, — падкрэсліла падчас уручэння ўзнагарод намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Алена Сімакова.

## Я — грамадзянін!

**Галіна ФІЛОН, педагог сацыяльны Высокаўскай сярэдняй школы Брэсцкай вобласці. Першае месца ў намінацыі "Вучэбна-метадычныя матэрыялы для правядзення факультатыўных і гуртковых заняткаў".**

— Прадставіла на конкурсе факультатыўныя заняткі па курсе "Вучымся жыць у міры і згодзе" для 8 класа па тэме "Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь". Мэта — азнаёміць навучэнцаў з нашай Канстытуцыяй, замацаваць у іх свядомасці, якія правы і абавязкі ёсць у кожнага з нас. Падчас заняткаў дзялю дзяцей на некалькі груп, кожнай даручаю прапрацаваць пэўныя артыкулы і сваімі словамі расказаць аб іх астатнім. Інфармацыя ў такім фармаце ўспрымаецца навучэнцамі з большай цікавасцю, чым падчас стандартнай лекцыі.

Як правіла, свае правы ўсе ведаюць куды лепш, чым абавязкі. Імкнёмся на занятках гэта выправіць. Заўсёды падкрэсліваю, што без абавязкаў няма і правоў. Кожны павінен любіць сваю Радзіму, абараняць яе, берагчы прыроднае асяроддзе, захоўваць нашу гістарычна-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці. І, вядома ж, вельмі важна паважаць годнасць і правы адно аднаго.

## Сімвалы роднага краю

**Марына ІГНАЦІК, настаўніца матэматыкі Дварэцкай сярэдняй школы Гродзенскай вобласці. Першае месца ў намінацыі "Распрацоўкі (матэрыялы) для правядзення мерапрыемстваў выхаваўчай накіраванасці, інфармацыйных і класных гадзін".**

— Для шостага школьнага дня мной распрацавана квест-гульня "Знаўцы сімволікі беларускай дзяржавы". Яна дапамагае навучэнцам 5—8 класаў замацаваць веды аб сімвалах Беларусі, геральдыцы абласцей і абласных цэнтраў, гісторыі дзяржаўных свят. Гэта не першая мая распрацоўка ў фармаце квест-гульні. Люблю гэты фармат за тое, што ён дазваляе жыва і цікава даносіць да дзяцей нават самую сур'ёзную і складаную інфармацыю.

Па правілах гульні, некалькі каманд перамяшчаюцца па школе ад адной станцыі да другой і выконваюць тэматычныя заданні згодна з атрыманым маршрутным лістом. Ролю станцый выконваюць школьныя кабінеты, дзе ўдзельнікаў чакаюць з заданнямі старшакласнікі. Пры гэтым каманды фарміруюцца змешаныя, каб ураўнаваць шансы на перамогу для навучэнцаў розных класаў.

## Кола правазнаўства

**Ірына ЗУБРЫЦКАЯ, педагог-арганізатар Капцянскай базавай школы Віцебскага раёна імя Героя Савецкага Саюза Г.С.Грыгор'ева. Адна з пераможцаў у намінацыі "Правы і абавязкі дзяцей".**

— Інтэрактыўная віктарына "Кола правазнаўства" была створана ў рамках школьнага лагера "Акадэмія права". Яна разлічана на навучэнцаў 2—5 класаў. Спачатку даю дзецям зразумелую для іх узросту інфармацыю па тэме правоў і абавязкаў, а потым правяраю і замацоўваю яе падчас віктарыны. У яе аснову пакладзены прынцыпы гульні "Поле цудаў". Кола спыняецца на пэўным пытанні з галіны права. Калі ўдзельнік ведае адказ — дае яго адразу, калі не — адгадвае па літарах. Пытаюся, напрыклад: "Што трымае ў руках багіня правасуддзя Феміда?", "Як называецца Асноўны закон Беларусі?", "Калі дзеці атрымліваюць свае першыя правы?". Падчас гульні вучні знаёмяцца з невядомымі ім словамі: канвенцыя, дэкларацыя, рэферэндум, выбаршчык. Такім чынам, дзеці і веды атрымліваюць, і цікава бавяць час.

**Аксана МЫЦЬКО.**
**Фота аўтара.**